NACIONALINĖ ŠVIETIMO AGENTŪRA

Pagrindinio ugdymo pasiekimų patikrinimo užduoties (raštu) I dalis
Заданне I-й (пісьмовай) часткі праверачнай работы за курс асноўнай школы

# GIMTOJI KALBA (BALTARUSIŲ)
# БЕЛАРУСКАЯ МОВА

Rašymas / Сачыненне

Час – 2,5 гадзіны

**УКАЗАННІ**

- Выберыце **адно з трох** прапанаваных **заданняў** і напішыце тэкст указанага жанру аб’ёмам 250 – 350 слоў.
- Пасля таго, як работа будзе напісана, пазначце, дзе заканчваюцца 250 слоў. У выпадку, калі слоў будзе менш, напішыце іх колькасць.
- Можаце выкарыстоўваць прызначаныя для чарнавіка аркушы паперы, але чыставы (канчатковы) варыянт тэксту запішыце ў адпаведнай табліцы, змешчанай у камп’ютары.
- Напішыце назву свайго горада / раёна, школы, класа, сваё імя, прозвішча, жанр / назву і адрасата сачынення ў адведзеным для гэтага месцы (над табліцай, прызначанай для чыставога варыянта тэксту).
- Калі пішаце ў чарнавіку, пакіньце дастаткова часу, каб перапісаць тэкст у прызначаную для яго табліцу ў камп’ютары, таму што чарнавік не будзе правярацца.
- Пішыце выразна, правільна.

Жадаем поспеху!

© Nacionalinė švietimo agentūra

Уважліва прачытайце ўсе тры заданні і выканайце **адно** з іх: напішыце альбо ліст, альбо артыкул, альбо сачыненне-разважанне. Змешчаныя ў заданнях пытанні можна выкарыстаць як падказку пры напісанні сачынення, але адказваць на іх не абавязкова.

## I заданне

“Народная творчасць наогул, а беларуская народная творчасць увасобку – гэта мора, якое хавае ў сабе незлічоныя скарбы. Толькі трэба ўмець гэтыя скарбы дастаць” (М. Гарэцкі). Як ты лічыш, ці актуальныя сёння сказаныя амаль сто год назад словы М. Гарэцкага? Якое месца займае фальклор у жыцці сучаснага грамадства, тваім жыцці? Якім чынам фальклор бытуе ў сучасным грамадстве? Напішы ліст удзельнікам фестывалю фальклорнага мастацтва, у якім падзяліся сваімі думкамі на гэтую тэму, прывядзі прыклады звароту да народнай творчасці вучнямі тваёй школы, тваёй сям’ёй.

**Жанр** – ліст
**Адрасат** – удзельнікі фестывалю фальклорнага мастацтва

## II заданне

“Адно з двух: або людзі зробяць так, што ў паветры стане меней дыму, або дым зробіць так, што на Зямлі стане меней людзей” (*Кур’ер ЮНЕСКА*).

Ці добра мы ахоўваем нашу прыроду, на колькі гадоў хопіць нам прыродных багаццяў? Як захаваць усё тое, што дала прырода не толькі для нас, але і для будучых пакаленняў людзей? Гэтыя трывожныя пытанні ўсё часцей узнікаюць перад кожным чалавекам.

Выкарыстоўваючы аргументы і прыклады з жыцця і мастацкай літаратуры, напішы прысвечаны Дню Зямлі артыкул на сайт школы, у якім выкажы свае адносіны да гэтай праблемы.

Не забудзь прыдумаць цікавую назву сачынення.

**Жанр** – артыкул
**Адрасат** – карыстальнікі сайта

## III заданне

Школа – гэта адна з першых прыступак нашага жыцця. Яна фарміруе характар, вучыць правільна адносіцца да навакольнага асяроддзя. У школе мы знаходзім сваіх першых сяброў, першае каханне. І заўсёды побач з намі добрыя, мудрыя дарадчыкі – настаўнікі, якія ў любы момант прыдуць на дапамогу, падкажуць, паправяць. Але пасля заканчэння школы нам прыдзецца самастойна будаваць сваё жыццё, вырашаць няпростыя пытанні.

Напішы сачыненне-разважанне на тэму “Настаўнікі толькі адчыняюць дзверы, далей мы ідзём самі”, у якім растлумач, што значыць, на тваю думку, быць гатовым да самастойнага жыцця, як ты разумееш словы “далей мы ідзём самі”.

**Жанр** – сачыненне-разважанне
**Адрасат** – твае равеснікі